УДК: 904.4(476.1)”654”

*М. А. Плавінскі*

# ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ РАСКОПАК МЯДЗЕЛЬСКАГА ЗАМКА Ў 2013—2015 гг.

*Артыкул прысвечаны аналізу вынікаў раскопок Мядзельскага замка канца XV — сярэдзіны XVII ст. (Мінская вобласць Рэспублікі Беларусь), якія праводзіліся ў 2013—2015 гг. Таксама разглядаюцца матэрыялы папярэдніх археалагічных даследаванняў помніка і дадзеныя наяўных пісьмовых крыніц.*

*Ключавыя словы: Мядзельскі замак, фартыфікацыя, прыватнаўласніцкая рэзідэнцыя, позняе Сярэднявечча, ранні Новы час.*

Сучасны Мядзел — гэта невялікі раенны цэнтр на паўночным захадзе Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь (мал. 1), аднак у канцы сярэднявечнай эпохі і ў перыяд ранняга Новага часу Мядзел з’яўляўся адным са значных эканамічных цэнтраў Верхняга Павілля, што неаднаразова прыцягвала ўвагу даследчыкаў да вывучэння пытанняў яго ўзнікнення і развіцця.



*Мал. 1.* Мядзельскі замак на мапе Усходняй Еўропы

## ПРАБЛЕМА ПЕРШАПАЧАТКОВАГА МЯДЗЕЛА

Першая згадка аб Мядзельскім замку (*castrum Medelo*) у пісьмовых крыніцах належыць да 1325 г. і ўтрымліваецца ў лісце вялікага князя Гедыміна [1]. На сучасным этапе даследаванняў можна меркаваць, што першапачаткова умацаванае паселішча з назвай «Мядзел» знаходзілася за 8 км на паўночны захад ад сучаснага аднайменнага горада. Яно размяшчалася на востраве Замак (мал. 2, *1*), які знаходзіцца на возеры Мядзел (Лотвінскі сельсавет Мядзельскага раена), дзе выяўлены комплекс археалагічных помнікаў (гарадзішча і селішча) старажытнарускага часу (мал. 2, *2*).

1. У.Ц. Пашута памылкова датаваў згаданую грамату 1324 г. [Пашуто, 1959, с. 526]. У далейшым гэтая дата пашырылася ў літаратуры і стала агульнапрынятай. Карыстаючыся з нагоды, прыношу шчырую падзяку С.У. Палехаву за кансультацыю ў дадзеным пытанні.

© М.А. ПЛАВІНСКІ, 2017




*Мал. 2.* Месцазнаходжанне гарадзішча і селішча на востраве Замак на возеры Мядзел (*1*), прыкладныя межы распаўсюджання культурнага слою і размяшчэне шурфа І 2014 г. у паўночна-ўсходняй частцы селішча на востраве Замак (*2*) (здымкі з Google)




*Мал. 3.* Гарадзішча і селішча на востраве Замак на возеры Мядзел, знаходкі з шурфоў 1981 г. (*1—16*) і шурфа 2014 г. (*17—24*): *2—13* — гарадзішча; *1, 14—24* — селішча (*1, 17—24* — мал. М.А. Плавінскага, *2—16* — пав. М.А. Ткачова)

Гарадзішча размяшчаецца на паўднева-ўсходнім ускрайку вострава. У 1956 г. помнік быў абследаваны Л.В. Аляксеевым [Алексеев, 1966, с. 82, рис. 14, *1*; Штыхов, 1971, с. 195]. Значных па аб’еме археалагічных даследаванняў гарадзішча не праводзілася, таму аб характары і храналогіі яго культурных напластаванняў можна меркаваць толькі папярэдне. У 1981 г. шурфоўку гарадзішча ажыццявіў М.А. Ткачоў. Ім было закладзена 4 шурфы памерам 2 × 2 м (мал. 3, *2—13*). Акрамя таго, М.А. Ткачоў выявіў селішча, размешчанае навокал гарадзішча, плошча якога была вызначана ў 2 га. На селішчы былі закладзены два шурфы памерам 2 × 2 м (мал. 3, *1, 14—16*) [Ткачоў, 1981, с. 5—7, мал. 42—43].

Л.В. Аляксееў на падставе выяўленай ім падчас разведкі кругавой керамікі датаваў узвядзенне гарадзшіча першай паловай XI ст. — часам княжэння ў Полацку Брачыслава Ізяс-

лавіча (1003—1044 гг.) і разглядаў помнік як парубежную полацкую крэпасць [Алексеев, 1966, с. 82]. М.А. Ткачоў лічыў, што гарадзішча ўзнікла ў IX—X стст. і спыніла свае існаванне ў XV ст. Менавіта М.А. Ткачоў упершыню выказаў думку аб тым, што археалагічны комплекс на востраве Замак возера Мядзел з'яўляецца першапачатковым Мядзелам, які ў далейшым быў пакінуты насельніцтвам і перанесены разам з назвай на ўсходні бераг возера Мястра. Функцыянаванне селішча на востраве Замак было датавана М.А. Ткачовым у межах XI/XII—XIII стст. [Ткачоў, 1981, с. 5—7].

У 2014 г. даследаванні на востраве Замак былі адноўлены экспедыцыяй пад кіраўніцтвам аўтара. У паўночна-ўсходняй частцы селішча быў закладзены шурф I плошчай 3 м$^2$. Выяўленыя ў ім матэрыялы (мал. 3, *17—24*) дазваляюць меркаваць, што пэўная гаспадарчая актыўнасць у паўночна-ўсходняй частцы селішча на востраве Замак на возеры Мядзел фіксуецца ўжо з эпохі бронзы. Аднак адкладанне культурнага пласта на даследаваным участку належыць да XI—XIII стст. У гэты час паўночна-ўсходняя частка селішча на востраве Замак актыўна выкарыстоўвалася ў гаспадарчых і вытворчых мэтах.

## МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ І СУЧАСНЫ СТАН МЯДЗЕЛЬСКАГА ЗАМКА

Мядзельскі замак размяшчаецца на паўвостраве возера Мястра ў паўднёвай частцы сучаснага Мядзела (мал. 4). Большая частка паўвострава ўяўляе сабой забалочаную нізіну, праз якую працякае рака Дробня, што ўпадае ў Мястра прыблізна за 300 м на поўдзень ад ніжняй (бастыённай) лініі замкавых умацаванняў. Дробня прыкладна да паловы аддзяляе паўвостраў ад берага, на якім месціцца сучасны Мядзел. Пры гэтым, у месцы, дзе рэчка робіць выгін на паўднёвы ўсход, з яе выцякае пратока. Гэтая пратока, якая цалкам аддзяляе паўвостраў ад берага і ўпадае ў Мястра з іншага (ад упадзення Дробні) боку. На плане мястэчка Мядзел другой паловы XIX ст. (мал. 5, *1*) добра бачна, што гэтая пратока мела шырыню блізкую ці нават роўную да шырыні Дробні (мал. 5, *2*). Гэта дазваляе меркаваць, што пратока мае штучны характар. Адпаведна, яе рэчышча было адмыслова пракапана, каб цалкам аддзяліць аканечнасць вострава, на якой месціўся замак, ад берага.

Пляцоўка, якую займае замак, уяўляе сабой пагорак марэннага паходжання памерам 135—140 м па лініі паўднёвы захад — паўночны ўсход на 100 м па лініі паўночны захад — паўднёвы ўсход (мал. 6). Схілы пагорка былі, відавочна, штучна эскарпаваныя падчас будаўніцтва замка. У паўночна-ўсходняй частцы пагорка размяшчалася мураваная вежа. Як




*Мал. 4.* Месцазнаходжанне Мядзельскага замку на паўвостраве возера Мястра (здымак з Google)

сведчаць апісанні замкавага пагорка, ен быў дадаткова ўмацаваны па перыметры паўкруглымі бастэямі. На сенняшні час яны захаваліся толькі часткова — прасочваюцца толькі тры бастэі. Дзве з іх размяшчаюцца з паўднёвага і паўднёва-ўсходняга бакоў замкавага пагорка, а трэцяя фіксуецца на паўночным яго баку.

На вялікі жаль, за апошнія паўстагоддзі пагорак, на якім размяшчаецца Мядзельскі замак, і навакольная тэрыторыя паўвострава зазналі значныя разбурэнні. Найбольш моцна пацярпела паўночна-заходняя частка паўвострава, дзе падчас стварэння парку імя «Трыццацігоддзя перамогі» ў 1974 г. быў закладзены футбольны стадыен. У выніку гэтых прац быў «падрэзаны» паўночна-заходні схіл замкавага пагорку, што прывяло да знішчэння размешчанай тут бастэі (бастэяў?). Падчас закладкі гэтага ж парку ўздоўж паўднёва-ўсходняга схілу замкавага пагорка была пракладзеная таполевая алея, якая часткова закранула адну з бастэяў, размешчаных з гэтага боку.

З мэтай падвышэння фартыфікацыйных якасцяў пагорак, на якім размяшчаўся Мядзельскі замак, быў з цягам часу дадаткова ўмацаваны валам з бастыенамі. На жаль, гэты вал зазнаў найбольшыя разбурэнні. Яго паўночна-заходні і паўночны ўчасткі былі цалкам спляжаныя падчас закладкі згаданага парку імя «Трыццацігоддзя перамогі» (падчас будаўніцтва стадыена). З усходняга боку знешні вал часткова спляжаны сцежкай, якая вядзе на вяршыню замкавага пагорка. Фактычна, на сенняшні дзень знешні вал захаваўся толькі з паўднёва-ўсходняга (на даўжыню каля 150 м) і часткова з усходняга (на даўжыню каля 120 м) бакоў замкавага пагорка. На гэтай адлегласці фіксуюцца чатыры бастыены.





*Мал. 5.* План мястэчка Мядзел другой паловы XIX ст. (*1*), паўвостраў, на якім размяшчаўся Мядзельскі замак, на плане мястэчка (*2*)

## МЯДЗЕЛЬСКІ ЗАМАК У СВЯТЛЕ ПІСЬМОВЫХ КРЫНІЦ [1]

Адной з асноўных праблем у вывучэнні Мядзельскага замка з'яўляецца надзвычай малая колькасць пісьмовых крыніц, якія тычацца яго гісторыі (мал. 7). Першым уласнікам Мядзела з воласцю стаў Жыгімонт Карыбутавіч з роду Гедымінавічаў. Пасля яго смерці ў 1435 г. тут зацвердзіўся ўплывовы на той час род Саковічаў: па чарзе Мядзелам валодалі Андрэй Саковіч (памер пасля 1465 г.), а затым яго сын Багдан (памер у 1490 г.). Першапачаткова іх права на валоданне гэтымі землямі не было аформлена пісьмова і падмацоўвалася тым, што яны абодва займалі пасады мядзельскіх старостаў. Толькі ў 1484 г. вялікі князь Казімір Ягелончык сваім прывілеем пацвердзіў Багдану Саковічу права ўласнасці на Мядзел і землі, якія да таго трымаў ягоны бацька Андрэй.

Упершыню Мядзельскі замак згадваецца ў 1544 г., калі пасля смерці Альжбеты Радзівіл з Саковічаў яе спадчыннікі дамовіліся замак «супольна трымаць». Аднак, ускосныя дадзеныя дазваляюць лічыць, што замак быў заснаваны ў канцы XV ст. (пасля 1484 г.) Багданам Саковічам. Аб гэтым сведчыць той факт, што ў прывілеі 1484 г. згадваецца «двор Мядзел» (*curia alias dworzysko Miadelo*), адпаведна, можна меркаваць, што ў гэты час замка яшчэ не існавала. У той жа час, у камісарскім дэкрэце 1744 г. па судовай справе паміж мядзельскім старостам Юзафам Бжастоўскім і ўладальнікам Старога Мядзела Антоніем Кошчыцам, пішацца, што «наступнікі Саковічаў (*Sukcessores Sakowiczowscy*) … замак узвялі …». Зыходзячы з гэтай згадкі, можна меркаваць, што ў сярэдзі-

---

1. Неацэнную працу па вывучэнні гістарычных звестак аб Мядзельскім замку зрабіў М.А. Волкаў, за што я прыношу яму самую шчырую падзяку. У сапраўдным раздзеле я прыводжу сціслыя вытрымкі без спасылак з нашага сумеснага з М.В. Волкавым артыкула, прысвечанага аналізу пісьмовых і археалагічных крыніц па гісторыі Мядзельскаму замку [Волкаў, Плавінскі, 2015].




*Мал. 6.* Інструментальны план Мядзельскага замка (інструментальная здымка Э.А. Астаповіча, 2013 г.) з пазначэннем мураванай вежы, раскопаў і шурфоў 2013—2015 гг. і прыблізнага месца размяшчэння раскопа 1981 г.

не XVIII ст. будаўніцтва замка адносілі да першай паловы XVI ст. і звязвалі са спадчыннікамі Багдана Саковіча.

У выніку шлюбу яго дачкі, апошняй прадстаўніцы роду Саковічаў, Альжбэты з Мікалаем Радзівілам Мядзельскі замак разам з іншымі уладаннямі пераходзіць да Радзівілаў. Недзе ў другой палове 1540-х гг. Мядзельскі замак перайшоў у распараджэнне караля і вялікага князя. У прыватнасці, у апісанні мядзельскай каралеўскай воласці 1545 г. года ен яшчэ не згадваецца, а ў 1550 г. гаспадар вызваліў мяш-




*Мал. 7.* Мядзельскі замак на мапе Томаша Макоўскага 1613 г.

чан ад неабходнасці даглядаць мост, што ішоў да замку, які, адпаведна, на той час ужо мусіў яму належаць.

Апошнія звесткі аб Мядзельскім замку змяшчаюцца ва ўжо згаданым дэкрэце 1744 г. Стварэнне гэтага дакумента было звязана з вострым канфліктам паміж уласнікам Старога Мядзела А. Кошчыцам і мядзельскім старостай Ю. Бжастоўскім. Імкнучыся павялічыць прыбытковасць сваіх маенткаў, А. Кошчыц у 1736 г. дамогся ад караля прывілею на заснаванне ў Старым Мядзеле мястэчка, што напрамую супярэчыла ўставе, дадзенай Мядзелу ў 1562 г., і пагражала эканамічным інтарэсам каралеўскага мястэчка. Апроч таго, уласнік Старога Мядзела распачаў адкрытую рэвізію старых межаў яго маентка з землямі староства. Сярод іншага, ен звярнуў увагу на замак, які кантраляваў доступ да возера Мястра з усходу і пяць тоняў на ім. Вядома, што на загад цівуна Старога Мядзела 31 сакавіка 1735 г. замак быў спалены. Што канкрэтна было знішчана, невядома. Аднак згадка ў тым жа дэкрэце 1744 г. аб тым, што зямлю на замку арэндавалі падданыя Старога Мядзела, сведчыць, што там знаходзіліся нейкія малазначныя гаспадарчыя пабудовы. Пасля гэтага тэрыторыя замка, верагодна, была закінутая цалкам. У прыватнасці ў дакуменце 1744 г. згадваецца «востраў пусты, на якім перад тым быў замак» [Волкаў, Плавінскі, 2015, с. 85—88].

## ГІСТОРЫЯ АРХЕАЛАГІЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ МЯДЗЕЛЬСКАГА ЗАМКА

Мядзельскі замак вядомы ў археалагічнай літаратуры з XIX ст. [Покровский, 1893, с. 33—34; Cehak-Hołubowiczowa, 1937, rys. 6]. У 1970 г. М.А. Ткачоў ажыццявіў абследаванне помніка і заклаў на яго тэрыторыі шурф памерам 2 × 2 м [Ткачоў, 1970, с. 20, 25; 1978, с. 95—97]. Дастаткова значныя па маштабах раскопкі на тэрыторыі замка былі праведзеныя М.А. Ткачовым у 1981 г. Даследаваная плошча склала 116 м$^2$ (мал. 8, *1*). Раскоп быў закладзены на пляцоўцы замка ўшчыльную да мураванай вежы. У выніку раскопак было выяўлена, што вежа мела вонкавы дыяметр 17,5 м, а яе муры дасягалі таўшчыні 3,75 м (мал. 8, *2—3*; 9; 10). Яна была збудаваная ў тэхніцы паласатай муроўкі з валуноў і цэглы-пальчаткі на вапнавай рошчыне. М.А. Ткачоў датаваў час пабудовы вежы XV ст. Грунтуючыся на матэрыялах сваіх раскопак, ен выказаў меркаванне, што ў пачатку XVI ст. з паўночнага боку ўшчыльную да вежы быў прыбудаваны мураваны палац, які меў шырыню 10 м і таўшчыню сцен 2 м [Ткачоў, 1981, с. 2—4].

На вялікі жаль, у справаздачы аб раскопках М.А. Ткачова за 1981 г. адсутнічаюць дакладны план і профілі раскопа [Ткачоў, 1981]. Апроч таго, схематычны план замка і план мураванай вежы былі арыентаваныя недакладна (мал. 8, *1, 2*). Усе гэта надзвычай ускладняе аналіз матэрыялаў раскопак 1981 г., магчымасць іх верыфікацыі і суаднясення з дадзенымі даследаванняў 2013—2015 гг.

Вынікі даследаванняў 1970 і 1981 гг. былі пакладзены ў аснову артыкула М.А. Ткачова, прысвечанага Мядзельскаму замку [Ткачоў, 1993а]. На жаль, гэты артыкул, гэтаксама як і іншыя тэксты М.А. Ткачова, прысвечаныя Мядзельскаму замку, адрозніваюцца блытанасцю і ўтрымліваюць пэўныя недакладнасці, якія ў далейшым былі неаднаразова паўтораныя ў працах іншых даследчыкаў [Бохан, 2008, с. 425; Заяц, 2001, с. 70, 81; Кушнярэвіч, 2011, с. 122; Чарняўскі, 1993, с. 66—67], у выніку чаго атрымалі шырокае распаўсюджанне ў літаратуры і фактычна сталі агульнапрынятымі, стварыўшы трывалы вобраз Мядзельскага замка як магутнай мураванай фартэцыі.

Вялікую ўвагу вывучэнню Мядзельскага замку надаваў Міх.М. Чарняўскі. У 1982 г. ен заклаў на замкавым пагорку 3 (?) шурфы (шурф 1 меў памер 4 × 1 м, апісанне шурфа 2 адсутнічае, шурф 3 памерам 3 × 1 м і размяшчаўся на «паўднёвым схіле замка») [1]. У 1997 г. Міх.М. Чарняўскі правеў чарговае абследаванне паўвострава і размешчанага на ім замка і склаў яго дастаткова дакладны план [Чарняўскі, 1998, мал. 6; Плавінскі, 2015, с. 333, мал. 4].

Акрамя самога замку, культурны пласт эпохі Сярэднявечча і Ранняга Новага часу выяўлены

1. На жаль, звесткі аб раскопках Мядзельскага замка не былі ўключаны Міх.М. Чарняўскім у справаздачу аб даследаваннях у 1982 г., аднак дзённікавыя запісы аб гэтых працах захаваліся ў яго асабістым архіве. Шчыра дзякую Макс.М. Чарняўскаму за дапамогу ў азнаямленні з палявымі дзённікамі Міх.М. Чарняўскага з яго асабістага архіва.




*Мал. 8.* Мядзельскі замак, 1981 г.: *1* — схематычны план замка з пазначэннем месца раскопак вежы XV ст.; *2* — план мураванай вежы і раскопак 1981 г. (*1* — ніша ваконнага праема; *2* — ніша дзвярнога праема; *3* — сцяна «палаца»; *4* — участкі сцен вежы, раскрытыя падчас раскопак 1981 г.; *5* — месца размяшчэння разрэза сцяны вежы і фундаментнага рва); *3* — разрэз фундаментнага рва (пав. М.А. Ткачова)

і на так званым «перадзамчы». Ен быў выяўлены Міх.М. Чарняўскім у 1979 г. Раскопкі на «перадзамчы» праводзіліся ў 1981 г. М.А. Ткачовым і ў 1985 г. Я.Г. Звяругам. Даследаваная плошча склала 88 м$^2$. Культурны пласт дасягаў таўшчыні 0,4—0,6 м. На тэрыторыі помніка былі таксама выяўленыя сляды неалітычнага паселішча [Ткачоў, 1993б].

## РАСКОПКІ МЯДЗЕЛЬСКАГА ЗАМКА Ў 2013—2015 гг.

Раскопкі Мядзельскага замка былі адноўленыя экспедыцыяй пад кіраўніцтвам аўтара ў 2013 г. Галоўнай мэтай даследаванняў 2013—2015 гг. стала вызначэнне стратыграфіі і планіграфіі замкавага пагорка і яго абарончых умацаванняў і далейшая распрацоўка рэкамендацый па праектнай дакументацыі і планавання прац па стварэнні на замкавым пагорку музея пад адкрытым небам.

У працэсе даследаванняў 2013 г. Э.А. Астаповічам быў зняты інструментальны план замка (мал. 6), на падставе якога ў далейшым архітэктар А.С. Вантух стварыў яго 3D-мадэль (мал. 11).

У 2013 г. на замкавым пагорку быў закладзены раскоп І плошчай 32 м$^2$ і шурф І плошчай 5 м$^2$ (даследаваны часткова (мал. 6)). Культурны слой у раскопе І меў невялікую магутнасць — дасягаў 0,3 м і быў цалкам перамяшаны шматразовым разворваннем. Акрамя таго, у раскопе І была выяўлена і часткова даследавана заглыбленая ў зямлю жылая пабудова першых дзесяцігоддзяў XVI ст. (мал. 12; 13, *1*—*5*) [Плавінскі, 2015].

У 2014 г. на пляцоўцы замкавага пагорка былі закладзены раскоп ІІ, шурфы ІІ і ІІІ агульнай плошчай 55 м$^2$, а таксама канчаткова даследаваны шурф І, закладзены ў 2013 г. (мал. 6).

Раскоп ІІ плошчай 34 м$^2$ быў закладзены ва ўсходняй частцы пляцоўкі замкавага пагор-




*Мал. 9.* Мядзельскі замак, мураваная вежа ў працэсе раскопак 1981 г. (фота з архіва Міх.М. Чарняўскага)




*Мал. 10.* Мядзельскі замак, мураваная вежа ў працэсе раскопак 1981 г. (фота з архіва Мядзельскага музея народнай славы)

ка і выцягнуты з захаду на ўсход. Магутнасць культурнага слоя ў раскопе II дасягала ад чатырох (у заходняй частцы) да сямі пластоў (у яго ўсходняй частцы) таўшчыней 0,1 м. Ва ўсходняй частцы раскопа II выяўлены падмурак мураванай вежы і будаўнічая траншэя перад ей (мал. 14). Падмурак вежы захаваўся на вышыню 0,7—0,95 м. Ен складаецца з валуноў і цэглы-пальчаткі на вапнавай рошчыне. Знешні бок мура складаецца з вялізных, абцясаных звонкі, валуноў памерам да 0,7 м, прастора паміж якімі закладзена цэглай і камянямі меньшага памеру. Унутры мур складаецца з шэрагаў цэглы-пальчаткі памерам да 35 × 16 см, укладзеных паралельна яго трасе.

Шурф II быў закладзены ў паўночна-ўсходняй частцы замкавага пагорка і меў форму выцягнутай з поўначы на поўдзень траншэі плошчай 17 м$^2$ (17 × 1 м; мал. 6). У цэнтральнай частцы шурфа былі выяўлены рэшткі жылой пабудовы, якая арыентавалася паралельна схілу замкавага пагорка — па лініі




*Мал. 11.* 3D-мадэль сучаснай дзеннай паверхні Мядзельскага замку, створаная А.С. Вантухам на падставе дадзеных інструментальнай здымкі Э.А. Астаповіча: *1* — від з паўднёвага ўсходу; *2* — від з поўдня — паўднёвага ўсходу

паўночны захад — паўдневы ўсход і, мяркуючы па наяўнасці насычаных плямаў вуголля і попелу, загінула ў пажары. Улічваючы тое, што шурф II меў шырыню ўсяго 1 м, было вырашана спыніць раскопкі ў яго цэнтральнай частцы ў 2014 г., не давеўшы іх да мацерыку, закансерваваць мяркуемыя рэшткі будынка, каб у далейшым звярнуцца да іх даследавання на большай плошчы.

У паўночнай частцы шурфа II, якая патрапіла на схіл замкавага пагорку, былі выяўлены два шэрагі камянеў, арыентаваныя з паўночнага захаду на паўдневы ўсход (паралельна схілу замкавага пагорка). Кожны з шэрагаў складаўся з вялікіх камянеў памерам да 0,3 м, выкладзеных у два ярусы (мал. 15). Прастора паміж вялікімі камянямі была забутаваная меньшымі камянямі памерам да 0,15 м і кавалкамі цэглы-пальчаткі. Адлегласць паміж двума шэрагамі камянеў складае 0,25—0,3 м. Можна ўпэўнена меркаваць, што каменная выкладка з двух шэрагаў з'яўляецца аснаваннем канструкцыі замкавых абарончых умацаванняў — вертыкальна ўсталяваных бярвенняў «тыну».

У паўночным квадраце шурфа II (кв. 1) назіралася рэзкае паніжэнне мацерыку — на глыбіню 1 м ад дзеннай паверхні. Гэта, відавочна, штучна эскарпаваны схіл замкавага пагорка. Ва ўсходнім профілі квадратаў 1 і 2 была выяўлена складаная стратыграфія, якая дазваляе ўдакладніць перыядызацыю і асаблівасці будаўнічай гісторыі замкавых умацаванняў. Над мацерыком (карычневы суглінак) залягае слой будаўнічага смецця (бітая цэгла, кавалкі вапны і кафлі) магутнасцю да 0,3 м, перакрыты слоем абпаленай гліны чырвонага колеру магутнасцю да 0,2 м. Слой абпаленай гліны сінхронны каменнай выкладцы — аснаванню абарончага тына. Слой абпаленай гліны і каменная выкладка перакрытыя магутным слоем будаўнічага смецця магутнасцю да 0,5 м (вялікія кавалкі бітай цэглы-пальчаткі, вапнавай рошчыны і фрагменты кафлі). Варта адзна-




*Мал. 12.* Мядзельскі замак, 2013 г., раскоп I, аб’ект 1: *1, 16* — бронзавыя шпількі «пус-епі»; *2* — каменны асялок; *3* — свінцовая куля; *4* — бронзавая заклепка ад тронкаў нажа; *5, 6, 9* — жалезныя іглу; *7* — жалезная акоўка похваў клінковай прылады (?); *8* — бронзавая зашпілька; *10* — жалезны прадмет невядомага прызначэння; *11* — бронзавая тыльная накладка на тронкі нажа; *12* — шкляная пацерка; *13* — дэнарый, ВКЛ, Аляксандр Ягелончык, (1492—1506 гг.), без даты; *14* — паўгрош, ВКЛ, Аляксандр Ягелончык, (1492—1506 гг.), без даты; *15* — жалезны нож; *17* — скрутак тонкага меднага дроту; *18* — апрацаваны крэмень (*1—17* — мал. М.А. Плавінскага, *18* — мал. А.М. Вашанава)

чыць, што ў абедзьвюх праслойках будаўнічага смецця выяўлены фрагменты кафлі адных і тых жа тыпаў (мал. 16), якія, на падставе існуючых аналогій, найбольш верагодна, могуць быць датаваныя 20—30 гг. XVI ст. [Veževičienė, 2014, p. 392, 21 pav.; Ţalnieris, Balčiūnas, 2007, 6, *1* pav.] [1].

На дадзены момант аналіз стартыграфіі шурфа II з’яўляецца найбольш інфарматыўным для вызначэння харанлогіі ўзвядзення і перабудовы замкавых умацаванняў. Адпаведна, можна меркаваць, што першапачаткова замкавы пагорак быў эскарпаваны. Верагодна, гэтыя працы праводзіліся адначасова з узвядзеннем мураванай вежы — у канцы XV ст. Прыкладна ў сярэдзіне XVI ст. у замку адбываюцца нейкія катастрафічныя падзеі, якія прывялі да разбурэння мураванага будынка (вежы?) і будынка ці будынкаў з кафлянымі печамі (ніжні слой будаўнічага смецця). Пасля гэтага праводзяцца працы па перапланіроўцы, у выніку чаго, будаўнічае смецце скідваецца на край пагорка. Пасля гэтага схіл абмазваецца глінай, якая з мэтай падвышэння яе трываласці абпальваецца, а па краі замкавай пляцоўкі ўсталеўваецца драўляны тын, умацаваны камянямі. Праз нейкі час адбываюцца новыя катастрафічныя падзеі (яшчэ адно разбурэнне замка?) ці чарговая перапланіроўка, пасля чаго ўтвараецца верхняя праслойка будаўнічага смецця, якая перакрывае і каменную выкладку ў аснаванні тына, і гліняную абмазку схіла пагорка. Зыходзячы з таго, што ў абедзвюх праслойках будаўнічага смецця выяўлены фрагменты кафлі адных і тых жа тыпаў, можна меркаваць, што абедзве катастрофы на замкавым пагорку адбыліся на працягу адносна кароткага перыяду часу — у межах некалькіх дзесяцігоддзяў.

1. Прыношу шчырую падзяку І.У. Ганецкай за дапамогу ў вызначэнні датавання кафлі з раскопак Мядзельскага замка.




*Мал. 13.* Мядзельскі замак, місападобная (*1*) і гаршковая (*2—8*) кафля: *1—5* — раскоп І, аб’ект 1; *6—8* — раскоп ІІ (мал. М.А. Плавінскага)



*Мал. 14.* Мядзельскі замак, 2014 г., раскоп ІІ; падмурак вежы і будаўнічая траншэя перад ей, від з захаду (фота М.А. Плавінскага)



*Мал. 15.* Мядзельскі замак, 2014 г., шурф ІІ; каменная выкладка на краі замкавага пагорка, від з поўначы (фота М.А. Плавінскага)

Варта адзначыць, што праслойкі будаўнічага смецця ў шурфе ІІ, верагодна, адпавядаюць дзвюм попельна-вугальным праслойкам, якія былі выяўлены М.А. Ткачовым у прылеглым да вежы профілі раскопа 1981 г. М.А. Ткачоў датаваў ніжнюю праслойку часам да 1535 г., бо менавіта ў гэтым годзе была адчаканеная манета, знойдзеная ў слаі, які яе перакрываў [Ткачоў, 1981, с. 2, рыс. 5а—5б]. Аднак, пытанне аб вузкім датаванні абедзвюх спаленняў (разбурэнняў), якія спасціглі Мядзельскі замак у сярэдзіне XVI ст., можа быць вырашана толькі шляхам назапашвання большага аб’ему матэрыялаў падчас новых раскопак.

Шурф ІІІ у форме траншэі памерам 4 × 1 м быў прырэзаны з поўначы да кв. 23 раскопу ІІ (мал. 6) з мэтай пошуку падмуркаў «мураванага палаца», апісаных М.А. Ткачовым у спра-




*Мал. 16.* Мядзельскі замак, 2014 г., шурф II; паліваная (*1—6, 9—12*) і тэракотавая (*7, 8*) кафля (фота М.А. Плавінскага)




*Мал. 17.* Мядзельскі замак, 2014 г., заходні профіль шурфа I (мал. М.А. Плавінскага)

вяздачы па выніках раскопак 1981 г. [Ткачоў, 1981, с. 14]. Аднак, з-за недахопу часу на ўзроўні каля 0,5 м распрацоўка шурфа была спыненая з мэтай аднаўлення раскопак на большай плошчы ў 2015 г.

Закладзены ў 2013 г. на паўднева-ўсходнім схіле замкавага пагорка шурф I (мал. 6) быў завершаны ў 2014 г. У шурфе была даследавана каменная выкладка, арыентаваная паралельна схілу замкавага пагорка. Выкладка складалася з двух шэрагаў камянеў, якія змяшчаліся на слаі глінянай абмазкі (мал. 17). Каменная выкладка ў шурфе I аналагічная той, што была даследавана ў шурфе II, што дазваляе казаць аб усталяванні тут у сярэдзіне XVI ст. такога ж драўлянага «тыну»,

У 2015 г. на пляцоўцы замкавага пагорка былі закладзены раскоп III плошчай 28 м² (уключыў у сябе не даследаваны да мацерыка ў 2014 г. шурф III), шурф IV плошчай 16 м², шурф V — 14 м², шурф VI — 20 м², шурф VII — 20 м², шурф VIII — 5 м² (мал. 6).

Улічваючы, што матэрыялы раскопак 2015 г. пакуль знаходзяцца ў стане апрацоўкі і асэнсавання, у дадзеным артыкуле прыводзяцца толькі сціслыя і самыя папярэднія вынікі гэтых даследаванняў.

Найбольш значным вынікам раскопак у 2015 г. стала выяўленне ў раскопе III і шурфе V рэштак падмурка з валуноў і цэглы-пальчаткі на вапнавай рошчыне. Падмурак быў арыентаваны па лініі паўночны захад — паўдневы ўсход — паралельна схілу замкавага пагорка. Можна меркаваць, што менавіта гэты падмурак М.А. Ткачоў прыняў у 1981 г. за мураваны будынак, які ен назваў палацам. Аднак, зараз есць усе падставы сцвярджаць, што будынак, які знаходзіўся з паўночна-заходняга боку ад муραванай вежы, быў драўляным. Можна меркаваць, што менавіта ўнутры гэтага будынку знаходзіліся печы, складзеныя з кафлі 20—30-х гг. XVI ст.

Шурф VIII быў закладзены на паўднева-ўсходняй бастэі замка (мал. 6) з мэтай вызначэння асаблівасцяў яе будовы. Было выяўлена, што абарончыя ўмацаванні бастэі ўяўлялі сабой вал, які быў зроблены з гліны, абпалены, а на яго вяршыні быў усталяваны драўляны тын, умацаваны ўнізе каменнай выкладкай, аналагічнай тым, што былі знойдзены ў шурфах I і II (мал. 18). Гэты факт дазваляе датаваць па-



*Мал. 18.* Мядзельскі замак, 2015 г., шурф VIII; вал бастэі і сляды ворыва на мацерыку, від з паўночнага захаду (мал. М.А. Плавінскага)

будову бастэй тым жа часам, што і ўзвядзенне тыну па перыметры замкавага пагорка, а менавіта — сярэдзінай XVI ст. Вялікую цікавасць выклікае той факт, што пад культурным слоем і насыпам вала бастэі на мацэрыку былі выяўлены сляды разворвання, што дазваляе сцвярджаць, што паўднева-ўсходняя бастэя замка была насыпана на колішнім ворыўным полі.

У сваю чаргу, гэты факт дае падставы меркаваць, што створаная ў сярэдзіне XVI ст. лінія ўмацаванняў (драўляны тын), якая ўключала паўкруглыя бастэі, займала большую плошчу (была пашырана ў паўднева-заходнім накірунку), чым першапачатковая ўмацаваная тэрыторыя замка. Дадзенае меркаванне пакуль варта разглядаць як гіпатэтычнае. Аднак, калі яно спраўдзіцца ў выніку наступных даследаванняў, можа з'явіцца перспектыва вызначэння этапнасці фармавання абарончых умацаванняў па перыметры замкавага пагорка.

## ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ РАСКОПАК МЯДЗЕЛЬСКАГА ЗАМКА Ў 2013—2015 гг.

Такім чынам, на працягу 2013—2105 гг. на пляцоўцы замкавага пагорка была даследавана плошча 191 $м^2$, што дазволіла атрымаць прынцыпова новыя дадзеныя аб планіграфіі і абарончых збудаваннях Мядзельскага замка. Суаднясенне вынікаў раскопак з максімальна шырокім колам гістарычных звестак дазваляе рэканструяваць асноўныя этапы гісторыі замка.

Мядзельскі замак засноўваецца ў канцы XV ст. як прыватнаўласніцкая рэзідэнцыя магнацкага роду Саковічаў. У гэты час будуецца магутная мураваная вежа. Можна меркаваць, што першапачаткова вежа была ўзведзена не ў самай высокай кропцы замкавага пагорка, а на яго схіле.

Перыяд непрацяглага росквіту Мядзельскага замка прыпаў на першую палову XVI ст., найбольш верагодна, на 20—30-я гг. гэтага стагоддзя, што выявілася ў актыўнай будаўнічай дзейнасці: пабудове на паўночны захад ад вежы драўлянага «палаца» на мураваным падмурку, абсталяванні жылых будынкаў кафлянымі печамі, складзенымі з кафлі, якая знаходзіць самыя блізкія аналогіі ў матэрыялах раскопак Вільні.

Зыходзячы з дадзеных пісьмовых крыніц, дзесці паміж 1545 і 1550 гг. замак пераходзіць ва ўласнасць вялікага князя. Разам з тым, аналіз стратыграфіі дазваляе меркаваць, што на працягу адносна кароткага часу ў сярэдзіне XVI ст. Мядзельскі замак двойчы перажыў нейкія падзеі катастрафічнага характару.

Пасля першага спалення (разбурэння?) Мядзельскі замак быў, верагодна, дадаткова ўмацаваны паўкруглымі бастэямі, а ўвесь перыметр замкавага пагорка (уключаючы бастэі) быў абнесены драўляным тынам. Каменная выкладка яго аснавання выяўлена на ўсходнім (у раскопе М.А. Ткачова 1981 г.), паўднёвым (у шурфе 3 Міх.М. Чарняўскага 1982 г., шурфе I) і паўночна-ўсходнім (у шурфе II) схілах замкавага пагорка, а таксама на вале паўднёва-ўсходняй бастэі. Аднак, і гэтыя ўмацаванні, напэўна, у хуткім часе пацярпелі ад чарговай катастрофы (спалення).

З пераходам ва ўласнасць каралеўскага скарба замак, як жыллевы і рэпрэзентатыўны комплекс, паступова прыйшоў у заняпад, чаму, верагодна, паспрыяла і яго двухразовае спаленне ў сярэдзіне XVI ст. Асноўнай функцыяй замка ў другой палове XVI — першай палове XVII стст. стала забеспячэнне абароны для жыхароў мястэчка Мядзела, якое развівалася побач з замкам. Пры гэтым, працы па мадэрнізацыі фартыфікацыйных збудаванняў, напэўна, працягваліся і ў другой палове XVI ст. — першай палове XVII ст., калі замак захоўваў пэўны абарончы патэнцыял. Верагодна, менавіта ў гэты час перад замкам быў насыпаны дадатковы земляны вал з бастыенамі, які ўзмацніў яго абарону.

Як умацаванне, Мядзельскі замак спыніў свае існаванне, найверагодней, у час войнаў сярэдзіны XVII ст., а яго тэрыторыя ў далейшым стала выкарыстоўвацца для гаспадарчых патрэб.

Прыведзеныя меркаванні дазваляюць сцвярджаць, што Мядзельскі замак з'яўляецца цікавым прыкладам прыватнаўласніцкай рэзідэнцыі, якая, нягледзячы на высілкі некалькіх пакаленняў уладальнікаў, так і не ператварылася ў паўнавартасны цэнтр магнацкай латыфундыі. Галоўнай прычынай для гэтага стала выміранне найперш роду Саковічаў, а затым галіны роду Радзівілаў, што валодала Мядзелам. Азначаныя перапетыі ў лесе ўладальнікаў замка, верагодна, паўплывалі і на асаблівасці фармавання замкавых умацаванняў. Узведзеная Багданам Саковічам вежа засталася адзіным мураваным элементам замкавай фартыфікацыі. Зараз цяжка меркаваць, ці планавалася тады ўзвядзенне муроў па ўсім перыметры замкавага пагорка. У кожным выпадку, нават, калі такая задума і мелася ў заснавальнікаў замка, яна ў далейшым так ніколі і не была ажыццеўлена.


*Алексеев Л.В.* Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии в IX—XIII вв.). — М., 1966. — 296 с.

*Бохан Ю.М.* Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст. — Мн., 2008. — 449 с.

*Волкаў М.А., Плавінскі М.А.* Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц // Архіварыўс. — 2015. — Вып. 13. — С. 65—92.

*Заяц Ю.А.* Замкі // Археалогія Беларусі. — Мн., 2001. — Т. 4: Помнікі XIV—XVIII стст. — С. 66—84.

*Кушнярэвіч А.М.* Мураваная дабастыенная фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага. — Мн., 2011. — 234 с.

*Пашуто В.Т.* Образование литовского государства. — М., 1959. — 531 с.

*Плавінскі М.А.* Раскопкі Мядзельскага замка ў 2013 годзе // МАБ. — 2015. — Вып. 26. — С. 331—340.

*Покровский Ф.В.* Археологическая карта Виленской губернии. — Вильна, 1893. — 164 с.

*Ткачоў М.А.* Справаздача аб палявых даследаваннях 1970 г. — Гродна, 1970 / ААНД ІГ НАН Беларусі. — Спр. № 377.

*Ткачоў М.А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. — Мн., 1978. — 144 с.

*Ткачоў М.А.* Справаздача аб палявых даследаваннях за 1981 г. — Гродна, 1981 / ААНД ІГ НАН Беларусі. — Спр. № 778.

*Ткачоў М.А.* Мядзельскі замак // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. — Мн., 1993а. — С. 450.

*Ткачоў М.А.* Мядзельскае селішча // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. — Мн., 1993б. — С. 450.

*Чарняўскі І.М.* Развіцце палацава-замкавых комплексаў Беларусі ў канцы XV—XVII стст. // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. — Мн., 1993. — С. 66—73.
*Чарняўскі Міх.М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1997 годзе. — Мн., 1998 / ААНД ІГ НАН Беларусі. — Спр. № 1697.
*Штыхов Г.В.* Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2. Памятники железного века и эпохи феодализма. — Мн., 1971. — 276 с.
*Cehak-Hołubowiczowa H.* Materiał i agadnienia cmentarzyska kurhanowego koło wsi Nawry w powiecie Postawskim // Rocznik archeologiczny. — Wilno, 1937. — T. 1. — S. 5—49.
*Veževičienė V.* Bernardinų gatvė 6B // Archeologiniai tyrinėjimai Lietuvoje 2013 metas. — Vilnius, 2014. — P. 385—392.
*Žalnieris A., Balčiūnas D.* Tyrinėjimai Santakos g. 14 // Archeologiniai tyrinėjimai Lietuvoje 2006 metas. — Vilnius, 2007. — P. 296—317.

*Н. А. П л а в и н с к и й*

## ПРЕДВАРИТЕЛЬНЫЕ РЕЗУЛЬТАТЫ РАСКОПОК МЯДЕЛЬСКОГО ЗАМКА В 2013—2015 гг.

Статья посвящена анализу материалов раскопок Мядельского замка (Минская область Республики Беларусь), которые проводились в 2013—2015 гг.

Замок находится на полуострове озера Мястро в южной части современного Мяделя. Его основание относится к концу XV в. и может быть связано с деятельностью Богдана Саковича. Упадок замка, вероятно, происходит в середине XVII в.

Имеющиеся данные позволяют полагать, что Мядельский замок является интересным примером частновладельческой резиденции, которая, несмотря на усилия нескольких поколений владельцев, так и не превратилась в полноценный центр магнатской латифундии. Главной причиной этого стало вымирание рода Саковичей, а затем и ветви рода Радзивиллов, которая владела Мяделем. Вероятно, именно судьбы владельцев замка повлияли на особенности формирования замковых укреплений. В результате этого, возведенная Богданом Саковичем кирпичная башня стала единственным элементом каменной замковой фортификации.

К л ю ч е в ы е  с л о в а: Мядзельский замок, фортификация, частновладельческая резиденция, позднее Средневековье, раннее Новое время

*M. A. P l a v i n s k i*

## PRELIMINARY RESULTS OF MIADZEL CASTLE EXCAVATIONS IN 2013—2015

This article analyzes the materials of Miadzel castle excavations (Minsk region of Belarus), which were carried out in 2013—2015.

The castle is located on a peninsula of Lake Myastra in the southern part of modern Miadzel. Its foundation dates back to the end of the 15th century and it may be associated with the activities of Bagdan Sakovich. The decline of the castle is likely to occur in the middle of the 17th century.

Available data suggest that Miadzel castle is an interesting example of a private residence, which, despite the efforts of several generations of owners, did not become a full-fledged center of magnate latifundia. The main reason for this was the extinction of Sakovich family, and then the branch of the Radziwill family, which owned Miadzel. Perhaps it is the fate of the castle owners influenced the features of the formation of its fortification. As a result of this, built by Bagdan Sakovich brick tower has remained the only element of a stone castle fortification.

K e y w o r d s: Miadzel castle, fortification, private residence, Late Medieval Period, Early Modern Period.

*Одержано 1.02.2016*